Буката І.І., студ. гр. 405
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Аждер Н.А.,
выкладчык

# ПРАБЛЕМА ІДЭНТЫФІКАЦЫІ КАФЛІ ПРЫ РЭСТАЎРАЦЫІ

У сувязі з актыўнымі археалагічнымі раскопкамі ў апошні час ідзе папаўненне музейных калекцый кафляй XVI-XVIII стагодззяў. У сувязі з гэтым паўстае праблема ў апісанні гэтых узораў.

Многія фондавыя калекцыі ў сваім складзе часта утрымліваюць не атрыбутаваныя, ці з недахопамі зыходных дадзеных узоры кафлі. У сувязі з гэтым, стварэнне каляровых сістэматызаваных каталогаў з узорамі кафлі розных рэгіёнаў, заводаў, майстэрняў значна палегчыла б працу музейных работнікаў. Добра было б стварыць каталогі, у якіх была змешчана абшырная ілюстраваная інфармацыя па абразцам кафлі. Пры гэтым правесці даследчыя работы па прыналежнасці кафлі да пэўных рэгіёнаў, заводаў, майстэрань.

## Рэгіянальныя асаблівасці кафлярства заходняга рэгіёну

У другой палове XVI стагоддзя кафлярства шырока распаўсюдзілася на Беларусі і стала адметнай рысай кожнага ганчарнага цэнтра. Майстры дапаўнялі арнаменты Заходняй Еўропы мясцовым матэрыялам і нацыянальнымі асаблівасцямі, уплятaлі ў вінаградныя гронкі і кукурузныя пачаткі кветкі павою, валошак, малявалі суніцы, рамонкі і іншыя мясцовыя расліны.

Сюжэты, пашыраныя на беларускай кафлі, можна разбіць на некалькі вялікіх груп: агульнадзяржаўныя (уласцівыя для тэрыторыі ўсяго ВКЛ); рэгіянальныя матывы, ці сюжэты, уласцівыя для некаторых вельмі блізкіх адзін да аднаго ганчарных цэнтраў (крэўскія, альшанскія, ашмянскія кафлі і інш.); індывідуальная кафля, якая часта была паліхромная і выраблялася па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецзаказу (перш за ўсё, геральдычная кафля з выявамі гербаў беларускіх магнатаў ці шляхціцаў), для ўласных пакояў.

З другой паловы XVI стагоддзя ў рамесных майстэрнях Мінска, Гродна, Лагойска, Ліды, Крэва, Міра і многіх іншых гарадоў цэнтральных рэгіёнаў пачынаюць вырабляць кафлю, упрыгожаную малюнкам кветак, сабраных у вазе, і проста "букетам". Трактоўка яе выяўленчых элементаў (стылізаванае лісце, кветка, ваза, яе ручкі) мае ў кожным разе свае ўласцівыя абрысы. Выявы раслін ў параўнанні з памерамі вазы значна большыя, што падкрэслівае алегарычнасць сюжэта. Пакрытыя зялёнай альбо нават шматколернай палівай рэльефы "букетаў", шмат разоў паўтараючыся, запаўнялі ўсю паверхню печы, стваралі ўражанне квітнеючай зямлі.

Ў канцы XVI – першай палове XVII стагоддзяў распаўсюджаным сюжэтам становяцца выявы раслін, закампанаваныя ў квадрат з невысокай рамкай на баках. Цікава тое, што геаметрычныя і раслінныя арнаменты маюць шмат розных рыс, часта капіруюць распрацаваныя матывы з ткацтва, разьбы па дрэву, кніг, абразоў. Сярод шматлікіх варыянтаў кафлі з раслінным арнаментам найбольш пашыраны варыянт, калі ў сярэдзіне вонкавай пласціны змешчана невялікая разетка, упісаная у квадрат або прастакутнік (Мір, Мінск, Вільня і інш.). У канцы XVI – першай палове XVII стагоддзяў у гэтым рэгіёне распаўсюджана кафля і з геаметрычным арнаментам.

Беларускія магнаты Радзівілы, Сапегі, Кішкі і іншыя ў гэты час заказвалі для сваіх замкаў і сядзіб кафлю па індывідуальных праектах, аздобленую іх родавымі гербамі.

## Рэгіянальныя асаблівасці кафлі усходняга рэгіёну

У першай палове – сярэдзіне XVII стагоддзя на першае месца выйшлі кафляры ўсходняй і цэнтральнай Беларусі (ў першую чаргу Полацка, Віцебска, Мсцісолава, Копысі, Оршы і Магілёва). Для кафлі з гэтых гарадоў уласціва шасцікутная ці васьміграная рамка, ў якую ўпісваліся розныя сюжэты, ў тым ліку "букеты кветак" у вазоне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Букет” таксама ўпісваўся ў архітэктурныя элементы, калоны і аркі, насычваўся выявамі коннікаў, воінаў, птушак, фантастычных звяроў.

З XVII стагоддзя ў выяўленчую тэматыку трывала ўваходзяць геральдычныя сюжэты (гербы гарадоў, цэхавых аб’яднанняў, магнатаў і шляхты, царкоўная эмблематыка). У XVII стагоддзі была пашырана кафля з манаграмай Ісуса Хрыста, уласцівая для ордэна іезуітаў.

Для гарадоў паўночнай і ўсходняў Беларусі гэтага перыяду ўласціва кафля з выявай двухгаловага арла. Яна знойдзена ў Друі, Полацку, Мсціславе, Крычаве і Магілёве.

З сярэдзіны XVIII стагоддзя галінкі з кветкамі рассоўваюцца, пераплятаюцца ў гірлянды і вянкі, сімвалізуючы трыумф славы і перамогі.

Хацелася б звярнуцца да выдання В.Е. Собаля, А.А. Трусава “Беларуская кафля”, у якім змешчана дастаткова абшырная інфармацыя па кафлі розных рагіёнаў са шматлікімі ілюстрацыямі да тэксту. Але, нажаль, для пэўнай ідэнтыфікацыі кафлі такога каталога недастаткова.

На прыкладзе гэтага выдання можна стварыць каталог з найбольш поўнай інфармацыяй, які б паслужыў дапаможнікам для работнікаў музея. Гэта б значна палегчыла працу пры рэстаўрацыі і вызначэнні прыналежнасці кафлі да пэўных яе абразцоў. У многіх фондавых калекцях такі каталог будзе сапраўдным скарбам для ўсіх музейных працаўнікоў.

Літаратура:

1. Здановіч, Н.І. Беларуская паляваная кераміка XI-XVIII стст. / Н.І. Здановіч, А.А. Трусаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993.

Сахута, Я.М. Беларуская народная кераміка / Я.М. Сахута. – Мінск: Полымя, 1987.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ